www.Belarus-Live.eu

BELARUS Live

NEWSLETTER
16/11-22/11/07

**ПАЛІТЫКА**
▪МЗС Беларусі пратэстуе супраць санкцый, уведзеных Мінфінам ЗША

**АФІЦЫЙНА**
▪Колькасьць насельніцтва Беларусі памяншаецца

**АПАЗЫЦЫЯ**
▪Праграма сьвяткаваньня 90-х угодкаў БНР

**ЭКАНОМІКА**
▪У Беларусі неспрыяльная падатковая сыстэма
▪Скараціласа рэнтабэльнасьць "Белнафтахіму"
▪У Беларусі падаражэлі прадукты

**ГРАМАДЗТВА**
▪Моладзі да 21 году могуць забараніць ужываць алькаголь — віцэ-прэм’ер Касінец

**КУЛЬТУРА**
▪Кіраўнік ТБМ спадзяецца, што Мінюст выправіць сваю памылку

17 лістапада ў Менску адбыўся ўстаноўчы зьезд рэспубліканскага грамадзкага аб'яднаньня "Белая Русь". Новая арганізацыя стваралася пад відавочным патранажам кіроўных вярхоў. Аналітыкі дыскутуюць, ці ёсьць гэта пачаткам фармаваньня ў краіне "партыі ўлады" паводле ўзору пракрамлёўскай "Адзінай Расеі".

Выглядае на тое, што прэзыдэнт Аляксандар Лукашэнка пакуль што не загарэўся праектам, але даў згоду на прапанову сваіх паліттэхнолягаў, каб мець варыянт гульні ў дэмакратыю на выпадак больш складаных палітычных варункаў.

Раней беларускі прэзыдэнт крытыкаваў расейскую мадэль "кіраванай дэмакратыі" і заяўляў, што ня мае патрэбы ў штучна створанай партыі. Сапраўды, беларускі рэжым мае выразна пэрсаналісцкі характар і грунтуецца на міталягізаванай наўпроставай сувязі харызматычнага "бацькі нацыі" з народам.

Разам з тым, палітолягі адзначаюць, што этап харызматычнай падтрымкі Аляксандра Лукашэнкі скончыўся, зараз яна ўжо інэрцыйная. Паводле зьвестак зарэгістраванага ў Вільні Незалежнага інстытуту сацыяльна-эканамічных і палітычных дасьледаваньняў, рэйтынг прэзыдэнта Беларусі зьнізіўся ад 60,3% у красавіку 2006 году (адразу пасьля апошніх выбараў кіраўніка краіны) да 44,9% у верасьні сёлета.

Гэтая тэндэнцыя на тле ўзмацненьня эканамічных цяжкасьцяў і вонкавага ціску як з боку Расеі, так і з боку Захаду змушае беларускае кіраўніцтва да пошуку больш гнуткіх мэханізмаў утрыманьня ўлады. На думку аналітыкаў, пры патрэбе імітаваць крокі да дэмакратызацыі ўнутрыпалітычнага жыцьця "Белая Русь" сапраўды можа быць трансфармаваная ў "партыю ўлады", якой звыклымі адміністрацыйнымі мэтадамі забясьпечаць ільвіную долю крэслаў у парлямэнце. Пакуль жа яе не сьпяшаюцца "раскручваць", трымаючы праект у зародкавым стане.

Між тым аб нарастаньні эканамічных праблемаў ускосна сьведчыць праведзеная прэзыдэнтам 16 лістапада нарада ў пытаньні скасаваньня льготаў. Зь 17 сьнежня будзе скасаваная бальшыня льготаў, якімі карыстаюцца каля дзьвюх трацін насельніцтва краіны (больш за шэсьць мільёнаў чалавек). Замест старой сыстэмы, што перайшла ў спадчыну ад СССР, прапануецца адрасная сацыяльная дапамога толькі найбольш неабароненай часткі насельніцтва. Колькасьць такіх людзей складзе каля 200 тысячаў.

Крытыкі ўлады згаджаюцца з тым, што старая сыстэма стала анахранізмам. Але яны лічаць, што найперш варта было б правесьці эканамічныя рэформы ды забясьпечыць насельніцтву магчымасьць дастойна зарабляць. Зараз жа, на думку апазыцыі, улада спрабуе банальна "заляпіць дзіркі" ў фінансах за кошт грамадзянаў.

Наяўнасьць сур'ёзных фінансава-эканамічных праблемаў мусіў прызнаць на згаданай нарадзе і сам Аляксандар Лукашэнка. Зь ягоных слоў, "нам трэба знайсьці 2,5–3 мільярды даляраў, нам трэба выйсьці на станоўчае сальда замежнага гандлю".

За студзень – верасень сёлета адмоўнае сальда замежнага гандлю таварамі і паслугамі склала 1505,5 млн. даляраў. Да канца году, як прагназуюць экспэрты, лічба дасягне двух мільярдаў са знакам мінус. Акрамя таго, паводле зьвестак Нацбанку, толькі за першае паўгодзьдзе сукупны замежны доўг Беларусі вырас на 37,5% — да 9,27 млрд. даляраў. На думку адмыслоўцаў, цяперашні курс уладаў на вырашэньне фінансава-эканамічных праблем за кошт замежных крэдытаў пагражае праз два-тры гады давесьці запазычанасьць краіны да небясьпечнай рысы. Варта дадаць, што крэдыты пераважна кароткатэрміновыя, то бок неўзабаве іх давядзецца сплочваць зь немалымі працэнтамі.

Яшчэ адной спробай кіраўніцтва дзяржавы адказаць на эканамічныя выклікі выглядае працэс продажу замежным інвэстарам акцый шэрагу прадпрыемстваў. Апанэнты ўлады адзначаюць, што гэтаму працэсу бракуе публічнасьці, няма конкурсаў і тэндэраў. Інфармацыя аб ўгодах становіцца здабыткам галоснасьці толькі пастфактум. Так, 20 лістапада на прэсавай канфэрэнцыі ў Менску генэральны дырэктар "Telekom Austria Group" Барыс Немшыч паведаміў, што гэтая кампанія завяршыла ўгоду датычна набыцьця кантрольнага пакету акцый беларускага апэратара мабільнай сувязі "Velcom". 70% акцыяў выкупленыя за 730 мільёнаў эўра. У 2010 годзе "Telekom Austria Group" разьлічвае выкупіць рэшту акцыяў.

Беларускія чыноўнікі заяўляюць, што гэтая ўгода паспрыяе разьвіцьцю тэлекамунікацыйных тэхналёгіяў у краіне. Апазыцыя крытыкуе ўлады за непразрыстасьць прыватызацыі і выказвае засьцярогу, што ў выніку кіроўная намэнклятура "канвэрсуе ўладу ва ўласнасьць" і сфармуе аўтарытарна-алігархічны рэжым.

---

## ПАЛІТЫКА

### МЗС Беларусі пратэстуе супраць санкцый, уведзеных Мінфінам ЗША

**МЗС Беларусі ўручыў ноту пратэсту амбасадару ЗША ў Беларусі Карэн Сьцюарт. Беларускі бок пратэстуе супраць санкцый, уведзеных Мінфінам Злучаных Штатаў у адносінах канцэрну "Белнафтахім".**

У дакумэнце МЗС зазначаецца, што дадзенае рашэньне парушае двухбаковыя дамоўленасьці, а таксама нормы міжнароднага права. Беларускія ўлады патрабуюць ад ЗША вярнуць арыштаваныя актывы іх уладальніку й зьняць усе абмежаваньні. Нагадаем, санкцыі былі ўведзеныя 13 лістапада за парушэньні правоў чалавека ў Беларусі.

## АФІЦЫЙНА

### Колькасьць насельніцтва Беларусі памяншаецца

**Міністэрства статыстыкі Беларусі падлічыла, што за 9 месяцаў гэтага году насельніцтва Беларусі скарацілася на 18 тыс. 800 чалавек. Каб зразумець, што гэта такое ў маштабе краіны, можна параўнаць, што гэта два такія гарады, як Фаніпаль.**

Разам з тым міністэрства адзначае станоўчую тэндэнцыю: за такі ж пэрыяд мінулага году ў краіне нарадзілася на 6 тыс. чалавек меней, а памерла на 3 тыс. 800 болей. То бок нараджацца дзяцей стала больш, а паміраць меней. Але да нулявога значэньня нам яшчэ вельмі далёка. Сёньняшняя лічба ў 18 тыс. 800 дае крыху аптымізму, бо колькі год таму Беларусь штогод страчвала ажно 40 тысяч чалавек. На сёньняшні дзень насельніцтва Беларусі складае 9 мільёнаў 695 тысяч 700 чалавек. Хаця школьныя падручнікі па геаграфіі й дзёньнікі дагэтуль вучаць дзяцей, што беларусаў 10 млн. 200 тыс. чалавек.

Міністэрства статыстыкі назвала й іншую жудасную лічбу: за 6,5 гадоў насельніцтва Беларусі скарацілася на 322 тысячы чалавек — гэта па колькасьці такі горад, як Берасьце!

Паводле прагнозаў ААН, да 2050 году насельніцтва рэспублікі складзе ўсяго 6,9 мільёна чалавек. У тым жа прагнозе гаворыцца, што беларусы будуць старэць. Цяпер сярэдні ўзрост па краіне — каля 38 год, да сярэдзіны стагодзьдзя ён складзе 49 год.

## АПАЗЫЦЫЯ

### Праграма сьвяткаваньня 90-х угодкаў БНР

**Партыя БНФ прыняла плян й канцэпцыю сьвяткаваньня 90-х угодкаў Беларускай Народнай Рэспублікі. Праграма разьлічана на 7 месяцаў — да сакавіка будучага году.**

Праца будзе весьціся ў чатырох кірунках — грамадзка-палітычным, навуковым, культурна-асьветніцкім і міжнародным. Кульмінацыйным момантам адзначэньня ўгодкаў павінна стаць запрашэньне эўрапейскіх палітыкаў і дыпляматаў на акцыю 25 сакавіка ў Менску, а таксама правядзеньне ў Эўрапейскім парлямэнце Дзён Беларусі.

На думку старшыні Партыі БНФ Вінцука Вячоркі, наступны год будзе годам абароны незалежнасьці Беларусі — як у эканамічным, так і палітычным пляне. "90 гадоў БНР — гэта нагода распрацаваць сыстэму захадаў абароны эканамічнай, нацыянальна-культурніцкай і палітычнай незалежнасьці", – дадаў В. Вячорка.

## ЭКАНОМІКА

### У Беларусі неспрыяльная падатковая сыстэма

**Беларусь заняла апошняе, 178-е месца па падаткаабкладаньні й падатковай абцяжаранасьці юрыдычных асоб. Гэта вынік дасьледаваньняў, праведзеных Сусьветным банкам.**

Сярод краін СНД Расея апынулася на 130-м месцы, а Украіна на перадапошнім, 177-м.

Для прыкладу, у год беларуская фірма павінна падаць у розныя ўстановы ажно 124 дэклярацыі, а ў Швайцарыі — толькі адну, прычым у электронным варыянце.

Паводле адмыслоўцаў, такі стан рэчаў перашкаджае разьвіцьцю прадпрымальніцтва ў Беларусі.

### Скарацілася рэнтабэльнасьць "Белнафтахіму"

**На прадпрыемствах канцэрну "Белнафтахім" рэнтабэльнасьць рэалізаванай прадукцыі, прац і паслуг у параўнаньні зь мінулым годам скарацілася амаль у два разы — з 28,8% да 14,6%.**

Паводле дадзеных Міністэрства статыстыкі й аналізу Беларусі, рэнтабэльнасьць продажу скарацілася з 18,3% да 10%. Прадпрыемствамі "Белнафтахіму" за дзевяць месяцаў атрымана прыбылі да падаткаабкладаньня 1,6772 млрд. рублёў. Гэта на 30,9% менш, чым за аналягічны пэрыяд мінулага году. Чыстага прыбытку атрымана на 34,9% менш, чым у 2006 годзе, паведамляе "Хартыя 97".

## У Беларусі падаражэлі прадукты

**Больш за ўсё ў лістападзе ў Беларусі падаражэлі хлеб, малако, ялавічына, сьвініна, малочныя прадукты, макароны, маянэз і кава.**

Цэны на прадукты ўзрасьлі на некалькі сот рублёў, у залежнасьці ад катэгорыі харчоў. Уплыў на рост цэн, у прыватнасьці, аказала падаражаньне прадуктаў харчаваньня ў суседніх зь Беларусьсю краінах.

# ГРАМАДЗТВА

## Моладзі да 21 году могуць забараніць ужываць алькаголь — віцэ-прэм’ер Касінец

**Беларускі ўрад мае намер ініцыяваць прыняцьцё закону аб здароўі нацыі. Паводле яго, маладым людзям да 21 году могуць забараніць ужываць сьпіртовыя напоі.**

Пра гэта ў інтэрвію беларускім СМІ заявіў віцэ-прэм’ер Аляксандар Касінец. Чыноўнік узрушаны абыякавымі адносінамі беларусаў да свайго здароўя. Паводле словаў Касінца, толькі ў выніку зваротаў працаздольнага насельніцтва краіны ў паліклінікі Беларусь губляе штогод 3,750 трыльёнаў рублёў валавага ўнутранага прадукту.

# КУЛЬТУРА

## Кіраўнік ТБМ спадзяецца, што Мінюст выправіць сваю памылку

**На перамогу здаровага сэнсу ў вырашэньні праблемы з прысваеньнем сталічным вуліцам імёнаў Янкі Брыля й Льва Сапегі спадзяецца старшыня Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны Алег Трусаў.**

Ён накіраваў лісты старшыні Менгарвыканкаму Міхаілу Паўлаву й міністру юстыцыі Віктару Галаванаву. У звароце да міністра юстыцыі Трусаў просіць патлумачыць, чаму Мінюст не зарэгістраваў рашэньня Менскага гарсавету аб прысваеньні адной са сталічных вуліц імя народнага пісьменьніка Беларусі Янкі Брыля. Раней у падтрымку гэтай прапановы ТБМ паступілі сотні зваротаў грамадзян.

Нагадаем, 26 верасьня Менскі гарсавет прыняў рашэньне пра прысваеньне дзьвюм новым вуліцам імён Янкі Брыля й канцлера Вялікага княства Літоўскага Льва Сапегі. Таксама была перайменаваная вуліца бальшавіка Берсана, яна атрымала назву ў гонар заснавальніка й фундатара Чырвонага касьцёлу Эдварда Вайніловіча. На сьнежаньскай сэсіі Менгарсавету чакаецца другі разгляд гэтай справы.

---

Belarus live

Існуе шмат сайтаў, прысьвечаных падзеям у Беларусі, аднак яны малавядомыя ў Заходняй Эўропе, асабліва тым, хто займаецца фармаваньнем палітыкі адносна Беларусі й ня ведае беларускай ды расейскай моваў.

European Radio for Belarus

polishaid

Сэрвіс belarus-live запаўняе гэты прагал. Штотыднёвую рассылку на ангельскай, польскай, беларускай ды расейскай мовах можна замовіць на сайце.

Polonia POLSKIE RADIO